## ПРЭЗЭНТ

Вадзім перадрукоўваў перадапошнюю старонку ўжо апоўначы, пры сьвятле настольнае лямпы. Машынка стаяла на абачліва падасланай ватняй коўдры, але званок у дзьверы перапыніў арытмічны ляскат яе клявіятуры. Вадзім паморшчыўся: "Мабыць, усё-такі было чуваць суседзям. Зараз давядзецца выбачацца..."

Але ў дзьвярах, прыхінуўшыся плячом да вушака, стаяў Стэфан, апрануты ў кашулю, хаця вечары выдаваліся ўжо халаднаватыя.

— А-а, шчасьлівы бацька! Віншую! — Вадзім паціснуў Стэфану руку. — Праходзь у пакой. Куды гэта ты зьнік? Мог бы хоць патэлефанаваць, пахваліцца.

— А што хваліцца? Нарадзіла ў сем месяцаў. — Стэфан апусьціўся на табурэт пры стале. — Апрача таго ў нас з жонкаю розныя рэзус-фактары, і ў яе — адмоўны.

— Не турбуйся, дагледзяць, выгадуеш! Колькі важыць малы?

— Два чатырыста.

"Чакай, здаецца, брат твой казаў, што кіло-дзевяцьсот і ня ў сем месяцаў, а у восем з паловаю..." — мільгнула ў Вадзіма згадка, але ён не падаў выгляду і сказаў: — Дык гэта й нямала. Дзе ляжаць?

— У другую ўладкаваў праз знаёмых... Як убачыў яе без жывата, дык цяпер яшчэ калачуся. І малы вось штосьці кепска дыхае...

— Не хвалюйся, ўсе будзе добра.

Стэфан памаўчаў з хвіліну, агледзеўся па баках і сказаў:

— А ты нічога, абстаўляесься пацiху. Стол, гляджу, набыў.

— Дзякуй. — Вадзім усьміхнуўся і мімаволі падумаў "Ты — адзіны з сяброў, хто не прыйшоў дапамагчы мне пераяжджаць... Не цягаў мэблю і ў Марціна, а "замачыць" ягоную кватэру прыйшоў. А чаго варта было вясельле, калі ты другі раз жаніўся з Марыляю?! Каб ня траціцца, сказаў гасьцям прыходзіць у рэстаран са сваімі грашыма замест падарункаў..."

— Слухай, — нібыта паслухаўшы Вадзімавы думкі, раптам спытаўся Стэфан, — а ў цябе часам ня будзе бутэлькі каньяку?

— Ну ты даеш! — ускрыкнуў Вадзім. — У каго нарадзіўся сын?! У мяне ці ў цябе? Хто частаваць павінен?!

— Прыходзіў я ўвечары, ды цябе не было, — млява азваўся Стэфан. — Пасьпеем яшчэ...

"Непераканаўча выходзіць, браце. Другі на тваім месцы заліў бы сьпіртным. Хаця чаго ад цябе чакаць? Мусіць, трэба звыкацца з тваімі адгаворкамі... Але як успомню твой колішні салодкі, безалькагольны дзень анёла, дзе ўсе пааб'ядаліся тартамі, дык і цяпер на ваніты бярэ. І ці ж гэта не экстрэмум зажыльваньня — жонка пасьля трыццаці нарадзіла першае дзіця, сына, а ты прыходзіш уначы і хочаш выпіць? Нездарма зь цябе кпілі, што і на сваё пахаваньне прадставіць зажыліш — знарок перажывеш усіх сяброў", — паківаў галавою Вадзім і сказаў:

— Ты мне зубы не загаворвай! Ды глядзі, не адцягвай: якраз момант такі, што хлопцы халасьцякуюць.

— Я ж сказаў...

Але Вадзіму падалося, што і гэтым разам у сябравым голасе не было пэўнасьці.

"Што за прывычка — хапаць чужыя рэчы, — раздражнёна падумаў ён, калі Стэфан узяў са стала, стаў пакручваць у руках скальпэль і зазірнуў у закладзены ў карэтку аркуш, — а тым болей чытаць чужое без дазволу!"

— Усё крэмзаеш, псуеш паперу? — пацiснуў плячыма Стэфан. — Кінь ты гэтае аматарства, займіся лепш дысэртацыяй — гэта надзейны кавалак хлеба. Ці ты думаеш зарабляць на жыцьцё сваімі дэтэктывамі?

— Проста мне цікава пісаць. Гэта як своеасаблівая гульня, намацваньне нечага няўлоўнага, як сон. А дэтэктыў — самы чытэльны жанр дый неблагі сродак псыхатэрапіі...

— Што-што? — ажывіўся Стэфан. — Нэўрапатолягу гэта вельмі цікава.

— Памятаеш, — пачаў Вадзім, — як у свой час Марцін напісаў некалькі аўтапартрэтаў? У кожным намагаўся выявіць, давесьці да абсалюту пэўную загану ці адмоўную рысу характару з тым, каб пазбавіцца яе. Я цяпер раблю нешта падобнае, каб унікнуць адмоўных эмоцыяў, беспадстаўнай агрэсіўнасьці. Мусіць, кожны часам адчувае штосьці падобнае. Заходзіць, скажам, у тралейбус незнаёмы. Не пасьпеў ён нават зірнуць на цябе, ня тое, што штурхнуць, а здаецца, як рэзнуў бы яму па мызе! І невядома за што!

Стэфан пакiваў галавою:

— Так, прырода падсьвядомага, на жаль, мала дасьледаваная...

— Толькі ня трэба спасылацца на псыхааналітыкаў, — перапыніў яго Вадзім. — Лепш сам прааналізуй, калі ты спэцыяліст, адзін выпадак. Расказаць?

— Давай! — пагадзіўся Стэфан.

— Гэта якраз са сфэры падсьвядомага, пра майго калегу, але прафэсійнага літаратара. — Вадзім на хвіліну задумаўся, а потым прадаўжаў:

— Была ў яго незвычайная прывычка — пісаць каляровымі алоўкамі, прычым колеры адпавядалі сюжэту, настрою кожнага эпізоду. Дык вось пазалетась, пачуўшы, што ў мяне дзень нараджэньня, ён і падараваў багаты набор каляровых алоўкаў.

Вадзім высунуў ніжнюю шуфляду стала, дастаў адтуль і раскрыў пачак. На алоўках блiснулі цiсьнёныя бронзаю герогліфы.

— У маленстве я маляваў такімі. А цяпер гэткага набору ў нас ня купіш. Хіба што натрапіш дзе-небудзь на барахолцы, — з выглядам знаўцы зазначыў Стэфан.

— Так, — пагадзіўся Вадзім. — Але я, на жаль, не магу ні маляваць, ні, тым болей, пісаць каляровымі алоўкамі. Даўно прызвычаіўся да аўтаручкі — вечнага пяра з чорным чарнілам. Пішу і нават праўлю ёю машынапіс. А шархаценьне графіту па паперы раздражняе...

Ведаеш, я дык заўсёды, калі атрымліваю падарунак, асабліва нечаканы, пачуваюся крыху няёмка. Нібыта бяру пазыку і ня ўпэўнены, ці змагу калі-небудзь вярнуць. Дый наогул, хапае з падарункамі клопату ды турбот. Даўно заўважыў, што каштоўныя яны не цаною, а сваёй прыдатнасьцю пэўнаму чалавеку або як прыемны напамінак. А вось пра тое, што сапраўдны падарунак — гэта ўсьвядомлены шлях да яго, даведаўся я нядаўна. Мусіць, жаль — гэта і ёсьць памінаньне дарагой рэчы, а падарунак — своеасаблівае ахвярапрынашэньне...

— Ня ведаю, ці шкада яму было таго набору, — крыху счакаўшы, прадоўжыў Вадзім, — але, каб хоць неяк аддзячыць, прэзэнтаваў я яму скальпэль. Помніш, іх, аднолькавых было ў мяне два. Таму даволі лёгка расстаўся з адным. Калі маеш аўтэнтычныя рэчы, то кожную зь іх цэніш куды меней, чым калі яна адзіная.

— Скальпэль — сапраўдная рэч. Дастанеш яго хіба што па знаёмстве ў нас, мэдыкаў.

Стэфан нібыта ўпершыню разглядаў інструмэнт, які час ад часу адсьвечваў, кідаў блікі на твары, на сьцены пакою.

— Той таксама быў надзвычай прыгожы дасканаласьцю формаў, халодным бляскам паліраваных паверхняў, — пацьвердзіў Вадзім. — Яго прыемна было трымаць у руцэ. Дзюбкаю вельмі зручна было б рэзаць паперу, а лязом — вастрыць алоўкі. Пісьменьнік надта ўсьцешыўся тады майму прэзэнту. І мне было прыемна, што змог парадаваць гэтага чалавека...

— А што за ён быў? — спытаўся Стэфан.

— Ды як табе сказаць... Меў даволі распаўсюджанае прозьвішча і, мусіць, густым басам, грываю сівых валасоў і барадою нагадваў архімандрыта. Хадзіў у чорным гарнітуры, у кашулі без каўняра і з расшпіленым верхнім гузікам. Нярэдка дэманстраваў сваю фэнамэнальную памяць, а па натуры быў вельмі кантактны і добразычлівы. Да нас, удзельнікаў сэмінару маладых літаратараў, ставіўся з павагаю, як да роўных, называў калегамі. У некаторых нават узяў апавяданьні і паабяцаў аднесьці у тоўсты часопіс, бо ў яго, маўляў, "лёгкая" рука. Але разам з тым праступала ў ягоным абліччы штосьці дэманічнае, інфэрнальнае.

— Покуль што ты апісваў архангела.

— Можа й так. Але я дагэтуль не магу даць веры таму, што пачуў днямі. У доме творчасьці ён пырнуў староньняга чалавека, які прыехаў адпачыць, і той неўзабаве памёр. Ну, што ты скажаш?

— Што атрымаў за мала фактаў, каб ставіць нейкі дыягназ. Былі ў яго на забойства якія-небудзь прычыны?

— Ня ведаю. Кажуць, пад’юдзіў яго сябра-сабутэльнік. Можа, ён і не зьбіраўся забіваць, а проста напалохаць ці пажартаваць хацеў, ды рука схібіла?

— А ці не заўважаў ты ў яго яшчэ якіх-небудзь дзівацтваў?

— Дзівацтваў?.. Вось хіба што часнаку ён на дух не пераносіў, проста цярпець ня мог. Заўсёды касавурыўся, калі ад каго патыхала часнаком.

— А я дык нядаўна зьеў зубок, — сказаў Стэфан і запытаўся: — Дык як тое ўсё-такі здарылася?

— А так. Зайшоу ў чужы катэдж і ўдарыў скальпэлем у грудзі. У таго на кашулі — нядаўна вярнуўся з саўны — адно толькі плямка крыві.

— Мабыць, перасек аорту і адбылося ўнутранае крывазьліцьцё... Чакай, чым ты кажаш ударыў?! — Скальпэль у Стэфанавых руках замёр.

Вадзім узяў яго ў сябра, схаваў у скураны футарал, паклаў у шуфляду і сказаў:

— Цяпер я напэўна ведаю, што нікому і ніколі яго не падарую.

— Каго табе болей шкада, знаёмага ці забітага? — асьцярожна спытаўся Стэфан пасьля доўгае паузы.

— Цяжка быць аб’ектыўным, калі аднаго ведаў, а другога не...

— А калі разважыць, паглядзець з другога боку, дык чым кат або судзьдзя лепшыя за злачынцу? Чаму яны пакідаюць за сабою права забіраць жыцьцё, якога не падаравалі?

— Мяне, шчыра кажучы, — азваўся Вадзім, — цяпер займае іншае. Тое, што мэдінструмэнт, які ты мне прынёс, а я падараваў, стаў халоднай зброяй, прыладаю забойства. Разумееш, праз яго мы ў нейкай ступені саўдзельнікі злачынства.

— Ну ты загнуў! Калі тое было і пры чым тут я?!

— Кожны нясе адказнасьць за тое, што робіцца на сьвеце. Адзін толькі ты заўсёды ні пры чым! — сказаў Вадзім і адвярнуўся да незашторанага акна.

Паўз вулічнае перакрыжаваньне пранесься легкавік зь мігалкаю, і Вадзіму прыгадаўся нядаўні выпадак.

Надвячоркам Стэфан з Марцінам сутыкнуліся ў падземным пераходзе з падлеткам-таксыкаманам, пашкадавалі яго і хацелі былі адвесьці дадому. А той стаў чапляцца да Марціна: давай, маўляў, біцца адзін на адзін. Стэфан і адышоў у бок, стаў у позу сэкунданта, хоць і ўбачыў, што ў руках у таксыкамана зьявіўся кастэт. "А калі б той пацэліў Марціну не ў пераносьсе, а у скронь?!" — зноў задаў сабе пытаньне Вадзім.

Але ягоны ўспамін перапыніў Стэфан.

— Кінь ты, ня дзьміся. Пайшлі лепей па двары пройдземся.

— Не хачу. Я нядаўна з ванны, баюся прастудзіцца. Дый ноч на дварэ.

— Дарма. Вечар даволі цёплы, — сказаў Стэфан і падняўся.

Вадзім пасьпешліва падаў сябру размаіты пачак.

— Вазьмі гэтыя алоўкі свайму малому.

— Ды калі яму яшчэ маляваць? — завагаўся Стэфан.

— Тры гады хутка прамінуць, і не агледзісься. Таму бяры, покуль даюць.

— Ну добра. Ты заўтра будзеш на катэдры? Я патэлефаную або забягу. Пасядзім з хлопцамі ў бары.

— Колькі чакаць абяцанага?

— Я ж сказаў. Калі ня будзе нічога тэрміновага, то заўтра. Дарэчы, даведка, што ты прасіў, ляжыць у тваёй паштовай скрынцы.

— Ты мяне проста выручыў! Бо якраз заўтра ў мяне камісія! — сказаў Вадзім і падумаў: "Вось жа добры ты хлопец. Трохі амбітны, але не

крыўдлівы, ня злыдзень які-небудзь. Добра робіш сваю справу, сяброў падтрымліваеш. Даваў і мне калі-некалі падзарабіць. Кажуць, праўда, што паразытуеш на Марціне. Ды яшчэ вось круціш, хлусіш, ня можаш стрымацца. Што гэта, якасьць, дадзеная ад нараджэньня або справакаваная падабцасным жыцьцём?"

Тым часам Стэфан узяўся за дзьвярную ручку і сказаў:

— Няма за што дзякаваць. Добрых табе сноў!

— Ня ведаю, як будзе сёньня, а ўчора я прысьніў, што разьбіў табе губу. Думаў, біцца палезеш, а ты адно пакрыўдзіўся і зваліў.

— Дзякуй, — Стэфан на імгненьне спалатнеў, зьмяніўся з твару, але адразу ж авалодаў сабою, нават паспрабаваў усьміхнуцца. — Калі кроў была, дык можа станем крэўнымі, празь дзяцей парадні́мся...

— Наўрад ці — крыві не было.

***

Цэлы тыдзень Вадзім ня бачыў Стэфана.

А ў панядзелак раніцою яму патэлефанаваў Марцін і сказаў, што Стэфанаў сын памёр у рэанімацыі.

— ...Штодня ён хадзіў, здаваў кроў малому на пераліваньне... Ды што ты хочаш — Марыля пры родах больш за гадзіну праляжала бяз догляду, без акушэрскай дапамогі. Патрапіла на пераразьменку.

— Так, гэта наша мэдыцына, наш гуманізм. У-у, касталомы праклятыя...

Вадзім націснуў на клявішу адбою і чамусьці згадаў колішнія Стэфанавы словы: "Сапраўднаму сябру, як і брату, даруеш усё. Калі ня можаш дараваць, значыць, гэта не сапраўдны сябар."

Падаліся дробязнымі і нікчэмнымі ўсе крыўды і нараканьні, падумалася: дараваў бы Стэфану ўсё што заўгодна, абы толькі не было гэткага званка. Яшчэ спадзеючыся, што выйшла памылка, Вадзім памкнуўся набраць сябраў нумар, але спыніўся, павесіў трубку.

1989

KAMUNIKAT.org